# Літанія да бласлаўлёнага Яна Паўла II

Аўтар: Рэдакцыя
27.05.2011 03:00



**Кірые, элейсон,**
**Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,**
**Хрыстэ, пачуй нас,**
**Хрыстэ, выслухай нас.**

**Ойча з неба, Божа,**
– змілуйся над намі.
**Сыне, Адкупіцель свету, Божа,**
– змілуйся над намі.
**Духу Святы, Божа,**
– змілуйся над намі.
**Святая Тройца, Адзіны Божа,**
– змілуйся над намі.
**Святая Марыя,**
– маліся за нас.
**Благаслаўлёны Ян Павел II,**
– маліся за нас.
**Заглыблены ў Айца, багатага на міласэрнасць,**
– маліся за нас.
**З’яднаны з Хрыстом, Адкупіцелем чалавека,**
– маліся за нас.
**Напоўнены Духам Святым, Панам і Жыватворцам,**
– маліся за нас.
**Цалкам аддадзены Марыі,**
– маліся за нас.
**Сябра святых і бласлаўлёных,**
– маліся за нас.
**Наступнік Пятра і Слуга слугаў Божых,**
– маліся за нас.
**Ахоўнік Касцёла, які навучае праўдам веры,**
– маліся за нас.

**Айцец Сабору і выканаўца яго пастановаў,**
– маліся за нас.
**Той, хто ўмацоўвае еднасць хрысціянаў і ўсяго роду людскога,**
– маліся за нас.
**Адданы шанавальнік Эўхарыстыі,**
– маліся за нас.
**Нястомны пілігрым гэтай зямлі,**
– маліся за нас.
**Місіянер усіх народаў,**
– маліся за нас.
**Сведка веры, надзеі і любові,**
– маліся за нас.
**Трывалы ўдзельнік Хрыстовых цярпенняў,**
– маліся за нас.
**Апостал паяднання і супакою,**
– маліся за нас.
**Натхняльнік цывілізацыі любові,**
– маліся за нас.
**Вястун Новай Евангелізацыі,**
– маліся за нас.
**Настаўнік, які заклікае выплысці на глыбіню,**
– маліся за нас.
**Настаўнік, які паказвае святасць як крытэрый жыцця,**
– маліся за нас.
**Папа Божай Міласэрнасці,**
– маліся за нас.
**Святар, які збірае Касцёл на складанне Ахвяры,**
– маліся за нас.
**Пастыр, які вядзе аўчарню да неба,**
– маліся за нас.
**Брат і настаўнік святароў,**
– маліся за нас.
**Айцец кансэкраваных асобаў,**
– маліся за нас.
**Апякун хрысціянскіх сем’яў,**
– маліся за нас.
**Падтрымка сужэнцаў,**
– маліся за нас.
**Абаронца ненароджаных,**
– маліся за нас.
**Апякун дзяцей, сіротаў і адзінокіх,**
– маліся за нас.
**Сябра і выхаваўца моладзі,**
- маліся за нас.
**Добры самаранін для церпячых,**
– маліся за нас.
**Дапамога людзям старэйшым і самотным,**
– маліся за нас.

**Вястун праўды аб годнасці чалавека,**
– маліся за нас.
**Чалавек малітвы, заглыблены ў Бога,**
– маліся за нас.
**Шанавальнік літургіі, які цэлебруе Ахвяру на алтарах свету,**
– маліся за нас.
**Увасабленне працавітасці,**
– маліся за нас.
**Той, хто палюбіў крыж Хрыста,**
– маліся за нас.
**Той, хто верна рэалізуе пакліканне,**
– маліся за нас.
**Трывалы ў цярпенні,**
– маліся за нас.
**Узор жыцця і памірання для Пана Бога,**
– маліся за нас.
**Той, хто павучае грэшнікаў,**
– маліся за нас.
**Той, хто паказвае дарогу заблуканым,**
– маліся за нас.
**Той, хто прабачае крыўдзіцелям,**
– маліся за нас.
**Той, хто паважае праціўнікаў і ганіцеляў,**
– маліся за нас.
**Заступнік і абаронца прыгнечаных,**
– маліся за нас.
**Той, хто падтрымлівае беспрацоўных,**
– маліся за нас.
**Той, хто клапоціцца пра бяздомных,**
– маліся за нас.
**Той, хто наведвае вязняў,**
– маліся за нас.
**Той, хто ўмацоўвае слабых,**
– маліся за нас.
**Той, хто вучыць усіх салідарнасці,**
– маліся за нас.

**Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,**
– даруй нам, Пане.
**Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,**
– выслухай нас, Пане.
**Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,**
– змілуйся над намі.

**С.** : Маліся за нас, бласлаўлёны Ян Павел ІІ.
**Н.** : Каб мы жыццём і словам абвяшчалі свету Хрыста, Адкупіцеля чалавека.

Молімся.
Міласэрны Божа, прымі падзяку за дар апостальскага жыцця і пасланніцтва блаславёнага Яна